Осуществляя поддержку и развитие профессиональной компетентности воспитателей дошкольного образования, их профессионально-личностных качеств, важным является использование как форм получения образования (в послевузовский период), так и разнообразных форм организации образовательного процесса в учреждениях системы образования республики. Целесообразно максимально задействовать резервы формального и неформального образования. В данном случае формами организации широкомасштабного образовательного процесса неформального образования в контексте непрерывного образования может выступать методическая работа с педагогическими кадрами на уровне учреждения образования и региональной методической службы. Формами организации формального образования по поддержке и развитию профессионально-личностных качеств воспитателей дошкольного образования являются повышение квалификации и переподготовка в системе дополнительного педагогического образования.

Актуальной и результативной формой поддержки и развития профессиональной компетентности специалистов учреждений дошкольного образования, в том числе значимых профессионально-личностных качеств, выступает дистанционная форма освоения программ повышения квалификации в рамках сетевого взаимодействия учреждений дополнительного педагогического образования. Содержательный контент такой формы работы обусловливает совершенствование разных видов компетенций воспитателей дошкольного образования, их аналитических и прогностических умений и навыков, а также развивает рефлексивную, самооценочную деятельность. При выполнении самостоятельной работы, зачётных заданий, связанных с обобщением опыта профессиональной деятельности, и блоков практико-ориентированных тестов у слушателей развиваются такие качества, как уверенность в своих возможностях на основе адекватной самооценки, целеполагание и планомерность в деятельности на основе аналитико-рефлексивных умений, коммуникабельность, тайм-менеджмент (организованность во времени), активность, инициативность [2]. В качестве примера можно привести образовательную программу повышения квалификации специалистов учреждений дошкольного образования «Совершенствование профессиональной компетентности педагогических работников в процессе аттестации», осуществляемую государственным учреждением образования «Академия последипломного образования» совместно с областными институтами развития образования.

**Заключение.** Необходимость развития профессионально-личностных качеств воспитателей дошкольного образования обусловлена как нормативными требованиями к его компетентности, так и спецификой профессиональной деятельности, учитывающей самоценность дошкольного детства, возрастные и индивидуальные особенности воспитанников, содержание современного дошкольного образования. Интеграция компетентностного, личностно ориентированного, деятельностного, акмеологического и андрагогического подходов призвана обеспечить научную обоснованность и грамотное методическое сопровождение процесса развития профессионально-личностных качеств воспитателей дошкольного образования в условиях непрерывного образования посредством разных форм, что, в свою очередь, ведёт к повышению их профессиональной компетентности, обеспечению качества дошкольного образования в целом.

**Список цитируемых источников**


1. *Шадриков, В. Д.* Профессиональный стандарт педагогической деятельности [Электронный ресурс] / В. Д. Шадриков // Вестн. образования. — 2007. — № 7. — Режим доступа: http://www.edu.doal.ru/docum/docum/project.pdf . — Дата доступа: 02.01.2019.
2. *Шашок, В. Н.* Инновации в самообразовании педагогов учреждений дошкольного образования / В. Н. Шашок // Подготовка кадров системы дошкольного образования как ресурс устойчивого развития общества : сб. науч. ст. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: О. Н. Анцыпирович [и др.] ; под общ. ред. О. Н. Анцыпирович. — Минск : БГПУ, 2018. — С. 438—442.


УДК 378


**А. А. Шкут**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Санаторны яслі-сад № 15 г. Светлагорска», Светлагорск*


## ДЗІЦЯЧА-БАЦЬКОЎСКІ КЛУБ «БУЛЬБАШЫКІ» ЯК ЭФЕКТЫЎНАЯ ФОРМА ПА ДАЛУЧЭННІ ДЗЯЦЕЙ ДА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ

**Уводзіны.** Дашкольнае дзяцінства з’яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для авалодання дзецьмі беларускай мовай, першай і вельмі важнай ступенню ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці дзіцяці. Далучэнне да беларускай мовы падрастаючага пакалення — адна з самых актуальных задач нашага часу. Развіццё асобы дзіцяці ў грамадстве немагчыма без ведання роднай мовы.

© Шкут А. А., 2019

Репозиторий БарГУ

**Асноўная частка.** Для большасці дзяцей першай мовай, якую яны чуюць ад бацькоў, на якой вучацца размаўляць з маленства, з'яўляецца руская. Дзеці не толькі не ўмеюць размаўляць па-беларуску, але і не разумеюць звернутую да іх мову. У сувязі з гэтым узрастае роля ўстановы дашкольнай адукацыі, на якую ўскладваецца адказнасць не толькі за развіццё камунікатыўных навыкаў у дзіцяці, але і за фарміраванне сродкамі роднай мовы нацыянальнай самасвядомасці, за перадачу літаратурнай спадчыны, культурных традыцый [1, с. 7].

Праблема павышэння статуса беларускай мовы ў выхаванцаў і бацькоў можа быць вырашана праз сумеснае ўзаемадзеянне ў дзіцяча-бацькоўскім клубе «Бульбашыкі», так як і сям'я, і дашкольная ўстанова маюць важную ролю ў развіцці і станаўленні асобы дзіцяці [2, с. 3]. Неабходнасць уключэння сям'і ў працэс азнаямлення дзяцей з сацыяльным акружэннем, мовай тлумачыцца асаблівымі педагагічнымі магчымасцямі, якімі валодаюць бацькі, што не можа замяніць дзіцячы сад: любоў і прыхільнасць да дзяцей, эмацыянальна-пачуццёвы бок зносін, іх грамадскі кірунак. Гэта і дае спрыяльныя ўмовы для выхавання высокіх маральных пачуццяў і мовы выхаванцаў. Праца клуба грунтуецца на рэалізацыі задач Вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі па адукацыйнай галіне «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» і арганізуецца па двух напрамках: праца з дзецьмі і праца з бацькамі.

Асноўнымі задачамі работы ў клубе «Бульбашыкі» з'яўляюцца: стварэнне спрыяльных умоў па павышэнні кампетэнцыі бацькоў у пытаннях далучэння дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту да беларускай мовы; дапамога бацькам і дзецям атрымаць цэласны пачуццёвы вопыт партнёрскага і даверлівага ўзаемадзеяння ў сумеснай рабоце па далучэнню да беларускай мовы; развіццё ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту пазнавальных і моўных здольнасцей, назіральнасці адносна моўных з'яў, навыкаў маўленчага самакантролю; накіраванне бацькоў на стварэнне ў сям'і ўмоў па далучэнні дзяцей да беларускай мовы.

Першая сустрэча ўдзельнікаў клуба — арганізацыйная. Для прыцягнення ўвагі бацькоў да ўдзелу ў пасяджэннях клуба вырабляюцца запрашальныя білеты, буклеты, у групе і на сайце ўстановы размяшчаюцца інфармацыйныя лісткі. На такой сустрэчы праводзяцца індывідуальныя гутаркі, прапаноўваюцца невялічкія апытальныя лісты, анкеты, праз якія высвятляюцца адносіны бацькоў да беларускай культуры і традыцый у далучэнні дзяцей да беларускай мовы. Па выніках анкет, а менавіта па выяўленых цяжкасцях у пытаннях далучэння дзяцей да беларускай мавы, а таксама па жаданні бацькоў, вызначаецца тэма будучых пасяджэнняў клуба, намячаецца прыблізная дата наступнай сустрэчы. Таксама вызначаецца форма і месца правядзення пасяджэння. Усяго за год плануецца і праводзіцца 4-5 пасяджэнняў клуба, якія арганізуюцца адзін раз у квартал, магчыма і часцей, па жаданні бацькоў. У залежнасці ад тэмы і формы правядзення пасяджэння клуба, сустрэчы арганізуюцца як ва ўстанове, так і за яе межамі. Больш за пяць гадоў клуб «Бульбашыкі» супрацоўнічае з краязнаўчым музеем горада Светлагорска, карціннай галерэяй «Традыцыя», домам рамёстваў.

Для таго каб падрыхтавацца да пасяджэння клуба, у рамках нерэгламентаванай дзейнасці плануецца і праводзіцца вялікая папярэдняя работа. Для пашырэння пасіўнага слоўніка дзяцям чытаюцца вершы, невялікія творы беларускіх аўтараў, загадваюцца загадкі. Абавязкова пры гэтым звяртаецца ўвага на новыя словы і фразы, якія ўжываюцца ў прачытаных творах, перакладаюцца на рускую мову.

Увядзенне новых слоў і фраз на беларускай мове ажыццяўляецца і пры арганізацыі дыдактычных гульняў («Знайдзі гаспадара», «Гарады і жыхары Беларусі», «Хто ў каго?», «Калі гэта бывае, у што мы пагуляем?»), рухомых беларускіх гульняў «(Блін гарыць», «Адгадай, чый галасок?», «Змяя»). У актыўны слоўнік дзяцей уводзяцца словазлучэнні «добрай раніцы», «смачна есці», «калі ласка», «да пабачэння». Як паказала практыка, такія ветлівыя словы добра замацоўваць у гульнявых сітуацыях («Свята ў Машы», «Паход у краму», «Пакласці лялек спаць»). У іх выхаванцы практыкуюцца ў выкарыстанні ветлівых слоў на беларускай мове. Гуляючы з дзецьмі, звяртаем увагу на добразычлівасць, правільнае вымаўленне і ўжыванне новых слоў. У якасці атрыбутаў выкарыстоўваецца лялечны тэатр, цацкі. Арганізаваная работа з дзецьмі не застаецца па-за ўвагай бацькоў. Кожны падрыхтоўчы этап аналізуецца. Для бацькоў рыхтуецца невялікая інфармацыя аб праведзенай працы ў выглядзе буклетаў «Зразумей мяне», дзе апісваецца, як дзеці разумеюць і разважаюць над значэннем новых беларускіх слоў. Па жаданні бацькоў да пасяджэння клуба рыхтуюцца відэа- і фотаматэрыялы гульнявых сітуацый, гутарак з дзецьмі з ужываннем новых беларускіх слоў.

На аснове папярэдняй працы з дзецьмі будуецца праца з бацькамі ў выглядзе хатняга задання, якое залежыць ад тэмы і мэты пасяджэння клуба. Часцей за ўсё такая праца накіравана на сумесную дзейнасць дзяцей і бацькоў. Гэта можа быць падрыхтоўка загадак, вершаў, малюнкаў або сямейнага часопіса; афармленне рэцэптаў беларускай кухні; выраб касцюмаў для тэатральнага прадстаўлення, праведзенага ў рамках клуба; распрацоўка крыжаванак.

Сумесная праца дапамагае згуртаваць дзяцей і бацькоў, сфармаваць паміж імі даверныя адносіны, убачыць магчымасці іх дзяцей пры азнаямленні з беларускай мовай, з нацыянальнымі традыцыямі і культурай. Выкананне хатняга задання матывуе бацькоў ажыццяўляць пошукавыя дзеянні ў мастацкай, даведчай, гістарычнай літаратуры, вывучаць інтэрнэт-крыніцы.

Пасяджэнні клуба праводзяцца ў розных формах. Так, напрыклад, круглы стол «Беларуская суполка» праводзіцца часцей за ўсё ў пачатку навучальнага года, пасля арганізацыйнай сустрэчы, ці ў канцы,

Рэпазіторый БарГУ

як падвядзенне вынікаў усіх сустрэч. На такім пасяджэнні разглядаюцца пытанні і выпрацоўваюцца сумесныя рашэнні па выкарыстанні эфектыўных метадаў і прыёмаў у далучэнні дзяцей да беларускай мовы, магчыма дэманстрацыя відэа- і фотаматэрыялаў з мэтай звароту ўвагі бацькоў на праблемныя бакі развіцця беларускай мовы ў сучасных дзяцей. Абавязкова праводзіцца гульня «Адкрыты мікрафон», дзе бацькі задаюць хвалюючыя іх пытанні аб далучэнні дзяцей да беларускай культуры і мовы.

Удзельнікамі семінараў-практыкумаў («Маміны казкі», «Беларускія гульні», «Роднае слова»), з'яўляюцца запрошаныя госці: педагог-псіхолаг, настаўнік пачатковых класаў, прадстаўнік краязнаўчага музея, дома рамёстваў, карціннай галерэі.

На пасяджэнні клуба ў форме майстар-класа адпрацоўваюцца практычныя навыкі бацькоў і дзяцей па правільным выкарыстанні беларускай мовы, пашыраюцца ўяўленні пра беларускую культуру і традыцыі беларускага народа. На такіх пасяджэннях выкарыстоўваюцца віртуальныя падарожжы «Па дарозе нашых продкаў», якія ўзбагачаваюць веды бацькоў і дзяцей пра гісторыю беларускага народа, родную мову, традыцыі сустракаць гасцей, спраўляць святы; рыхтавацца да сяўбы або збору ўраджаю; паходжання бульбы, як асноўнага прадукта нацыянальнай кухні. Матэрыял для «падарожжаў» падбіраецца з улікам узросту дзяцей і з'яўляецца даступным для ўспрымання як дзяцей 5-6 гадоў, так і бацькоў.

Як паказвае практыка, пасяджэнні клуба ў форме «майстар-клас» дазваляюць рэалізаваць патрэбу ва ўсталяванні ўзаемаразумення паміж педагогамі, бацькамі і дзецьмі; абменьвацца эмоцыямі, ведамі, вопытам так, каб выхавальнік не навязваў свой пункт гледжання, а даваў магчымасць кожнаму з бацькоў прыняць актыўны ўдзел.

Цікавай і запатрабаванай формай правядзення пасяджэння клуба з'яўляецца «Сямейная віктарына», якая накіравана на выхаванне пачуцця любові і павагі да старэйшых, гонару за сваю сям'ю, бо нацыянальнае самапазнанне пачынаецца з сям'і, з пазнання сямейных каштоўнасцей. Віктарыны пачынаюцца з дэманстрацыі хатняга задання: выставы творчых работ, фотагалерэі «Зазірніце ў сямейны альбом». Дзеці разам з бацькамі стараюцца расказваць пра сваю сям'ю на беларускай мове, кіраўнік клуба ім дапамагае. Далей дарослыя са сваімі дзецьмі дзеляцца на дзве ці тры каманды, прыдумляюць назву каманды на беларускай мове, выконваюць раней запланаваныя кіраўніком клуба заданні.

Разнастайнасць формаў арганізацыі дзіцяча-бацькоўскага клуба «Бульбашыкі» зацікаўлівае бацькоў і дзяцей прымаць актыўны ўдзел у кожным пасяджэнні.

Кожнае пасяджэнне клуба праводзіцца на беларускай мове. Калі дзеці або бацькі не разумеюць некаторыя словы ці фразы, яны перакладаюцца на рускую мову. Кіраўнік адзначае для сябе: над якімі словамі неабходна папрацаваць з дзецьмі ў рамках рэгламентаванай і нерэгламентаванай дзейнасці; якое хатняе заданне даць дарослым і дзецям.

Да апошняга пасяджэння клуба (як выніку праведзенай работы) рыхтуецца часопіс «Разам да беларускай мовы», які ўключае рубрыкі «Вучымся размаўляць па-беларуску», «Чую, бачу, гавару» і г. д.

У выніку праведзенай работы бацькі адчуваюць сябе больш кампетэнтнымі ў навучанні дзяцей роднай мове. Адбыліся значныя змены ў значнасці беларускай мовы ў сям'і, сталі прадпрымацца спробы размаўляць з дзецьмі па-беларуску дома. Пашырыўся слоўнікавы запас беларускіх слоў; з'явілася цікавасць да пасяджэнняў клуба.

**Заключэнне.** Выхаваццелю дашкольнай адукацыі трэба мець вялікае жаданне працаваць над праблемай адраджэння беларускай мовы, усведамляць сваё месца і ролю ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці і выхаванні павагі да народнай культуры, гісторыі і ў бацькоў, і ў дзяцей. Як паказвае практыка, толькі пры сумесных намаганнях установы дашкольнай адукацыі, сям'і, а таксама ўзаемадзеянні з аб'ектамі соцыума можна атрымаць станоўчыя вынікі.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Дубініна, Д. М.* Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору : дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна. — Мінск : Новое знание, 2016. — 208 с.

2. *Гуз, А. А.* Взаимодействие дошкольного учреждения и семьи : пособие для педагогов учреждений, обеспечивающих получение дошк. образования / А. А. Гуз. — Мозырь : Белый Ветер, 2007. — 191 с.

Рэпазіторый БарДУ